дыктавалася імкненнем адэкватна паказаць рэчаіснасць. Ствараемы пісьменнікамі мастацкі свет адлюстроўваў як атмасферу гістарычнага часу, так і спецыфіку народнага светабачання і аўтарскай індывідуальнасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Купреянова Е.П., Макогоненко Г.П.* Национальное своебразие русской литературы. Л., 1976. С. 6.
2. *Галавач П.* Збор твораў: У 3 т. Т.1. Мн.,1958. С. 156.
3. *Чорны К.* Збор твораў : У 8 т. Т.1. Мн.,1972. С. 149.
4. *Калюга Л.* Творы. Мн., 1992. С. 375.
5. *Драгомирецкая Н.В.* Стилевые искания в ранней советской прозе // Теория литературы: Осн. проблемы в ист. освещении: В 3 кн. Кн. 3 М.,1965. С. 136.
6. *Зарэцкі М.* Збор твораў: У 4 т. Т.2 . Мн., 1990. С. 147.
7. *Каваль В.* Як вясну гукалі . Мн.,1927. С. 70-71.
8. *Каваль В.* Выбранае. Мн.,1961. С. 12.



S U M M A R Y

*In the artistik ethnographism in the prosaik works of the young Belorusian writers of the 20th years of the XX century is investigated.*



*Поступила в редакцию20.05.2002*

УДК 882.6–1



**І.М. Гоўзіч**


# Элегія ў творчасці Янкі Сіпакова

Даўно ўжо вядома, што жанравая структура сённяшняй лірыкі – «разамкнёная», бо яна карыстаецца і ўзбагачаецца лепшымі дасягненнямі трох родаў літаратуры. І не менш выразны «сінтэтызм» лірычнай паэзіі Янкі Сіпакова выяўляецца ў ягонай элегіі. Элегія, як і ода і балада, мае таксама даўнюю гісторыю. Лічыцца, што творы элегічнага характару – адны з самых старажытных твораў паэтычнага мастацтва. Пра гэта чытаем у новых кніжках В.П. Рагойшы, адрасаваных перш за ўсё спецыялістам філолагам. У апошнім па часе выданні гэтага даследчыка чытаем: «Вытокі беларускай літаратурнай элегіі – у народнай песні (працоўнай, абрадава-сямейнай), у вопыце рускай і сусветнай літаратур, што ўплывалі на беларускую. Элегія як жанр з'явілася ў XIX стагоддзі («Думка» Ф. Багушэвіча, «Могілкі» невядомага аўтара). Значнае месца займае ў творчасці М. Багдановіча, выяўляючы асабістыя і грамадскія матывы...» [1]. У пачатку свайго артыкула В.П. Рагойша адзначае старажытнасць паходжання жанра: у эпоху антычнасці элегія спачатку была тэматычна разнастайная (нараджэнне, жыццё і смерць), а затым у старажытным Рыме стала жалобнай песняй (плачам над нябожчыкам – І.Г.), скаргай на цяжкі асабісты ці грамадскі лёс (Тыбул, Авідзій, Катул). Усё сказанае тэарэтыкам слоўнага мастацтва доказнае, цікавае, нясе энцыклапедычную інфармацыю. Вось толькі час з'яўлення літаратурнай элегіі ў беларускай літаратуры, як нам думаецца, не зусім правільна аднесены аўтарам да XIX стагоддзя, другой паловы яго. Між тым, як ужо «Плач Яраслаўны» са «Слова аб паходзе Ігаравым» – своеасаблівая стараўсходнеславянская элегія XII стагоддзя, з элементамі эпітафіі, блізкай да яе па змесце [2]. Не меншую рацыю будзем мець мы, калі вытокі

(змястоўныя) старажытнага жанру адзначым у «Трэнасу» М. Сматрыцкага – плачу па пакінутай царкве. Пра тое ж самае знаходзім і ў іншых крыніцах.

«Элегія (грэч. *elegeia* – жалобная песня, ад *elegos* – скарга) – верш, у якім выяўляецца смутак, журба, меланхолія з прычыны грамадскай несправядлівасці, сямейнага няшчасця і асабістага гора» [3]. Значыць, элегія – сумны верш, які грунтуецца на сентыментальнай разнавіднасці пафасу і, часцей за ўсё, выяўляе незадаволенасць лірычнага героя (элегія заўсёды пішацца ад імя першай асобы, гэта спавядальны, маналагічны па структуры твор) жыццём, станам душы. Элегія – гэта, калі гаварыць шырока, скарга на неспрыяльныя абставіны, якія не можа пераадолець чалавек.

Аднак, з цягам часу змястоўнасць жанру паслядоўна мянялася. Нават, з'яўляючыся плачам па нябожчыку, яна набывала ў старажытныя часы новую змястоўнасць і ператваралася ў твор-зварот да суайчыннікаў бараніць Радзіму ад ворагаў. Элегія старажытнагрэчаскіх паэтаў мела «цвёрдую» форму, выкарыстоўвала элегічны двуверш, часам поўнілася эратычным зместам. Паступова з'явілася філасофская элегія, якая была трывожнай па сутнасці. У эпохі ўзвелічэння чалавека як асобы, культу яго высокіх магчымасцей элегія плённа развівалася ў літаратурах многіх краін Заходняй Еўропы, набывала значэнне высокае, урачыстае, прасякнутае фактарам трагедыйнасці як своеасаблівага катарсісу. Класіцызм адкінуў элегію як камерны жанр, надаў перавагу ўрачыстай одзе і грамадзянскай сатыры, таму элегія некалькі заняпала ў XVII–XVIII стагоддзях. Аднак варыянт «урачыстага твора» існаваў і тады: элегія Ламаносава, Сумарокава культывавала барацьбу пачуцця і розуму, думкі. Новы перыяд узлёту элегіі – сярэдзіна XVIII стагоддзя, дарамантызм, калі з'явілася элегія «начных дум» у форме медытацыі пра вечнае і часовае, хуткаплыннасць і нетрываласць чалавечага жыцця, лірычны герой у такой паэзіі прасякнуты песімістычным настроем, расчараваўся ў жыцці.

У беларускай літаратуры ўзнікненне элегіі звязана з лёсам рамантызму і рамантыкаў, з вызваленчым рухам і нарастаннем пратэсту супроць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску. У гэты ж час у рамантызме склаліся сузіральна-апісальная і філасофска-медытатыўная разнавіднасці элегіі. Нешта падобнае назіраецца і ў нашыя дні, калі элегія як балада ды іншыя традыцыйныя лірычныя і ліра-эпічныя жанры, таксама развіваецца паскорана, удасканальваецца, узбагачаецца і паглыбляецца новым зместам. Элегічны смутак часцей выражае незадаволенасць мастакоў суровымі абставінамі жыцця, якія паслабляюць, абмяжоўваюць чалавечыя магчымасці, накладваюць ланцугі на чалавечую духоўнасць.

Паводле слоў даследчыкаў паэзіі (М.І. Мішчанчук), элегія становіцца актыўным жанрам тады, калі паскараецца інтэлектуальнае развіццё грамадства, ці, наадварот, калі яно згасае і затухае. У другім выпадку яна стараецца раскатурхаць мысленне мастакоў і грамадства ў цэлым, прасякваецца духам пратэсту ў часы духоўнага заняпаду. Таму элегічны настрой і элегічны жанр становіцца сёння своеасаблівым барометрам сучаснасці. Няспраўджаныя надзеі, нявер'е ў тое, што неўзабаве прыйдуць светлыя дні радасці і дастатку, застой сацыяльны і духоўны паўплывалі на развіццё элегіі як у 60-я – 70-я гады, так і ў наш час.

Таму ў творчасці сумленных мастакоў слова гэтыя перыяды сталі часам самаацэнкі, самарэфлексіі, пошуку праўды. І менавіта з гэтай прычыны «сучасная беларуская элегія ў пераважнай большасці аказваецца яшчэ больш эталагічнай, чым элегія рамантыкаў. У ёй яшчэ выразней раскрываецца ўстаноўка на ... выхаванне чалавека» [4].

Яшчэ да пачатку XX стагоддзя склаліся тры асноўныя разнавіднасці элегіі: эталагічная або публіцыстычна-заклікавая, медытатыўна-філасофская і апісальна-выяўленчая. Гэтыя тры разнавіднасці часта ўзаемадзейнічаюць і дапаўняюць адна адну, але элегічны пафас у іх застаецца аднолькавым – гэта пафас

суму, расчаравання, незадаволенасці, шкадавання і адпаведны яму глыбокі псіхалагізм як вынік імкнення аўтараў паказаць змены, зрухі, эвалюцыю ўнутраных перажыванняў незадаволенага жыццём лірычнага героя.

Як ужо адзначалася намі вышэй, элегіі ў нашыя дні пішуць шматлікія паэты, але «элегіі Сіпакова адрозніваюцца ад элегій малавопытных аўтараў шматварыянтнасцю, маштабнасцю зместу» [4], пры поўным захаванні смутку, самоты і жалю, як яе традыцыйнай змястоўнасці. Пра гэтае якраз і сведчыць кніга паэта «У поўдзень, да вады», першая частка якой складаецца пераважна з элегій, ці не лепшая ў творчасці паэта 60-70-х гадоў.

Перад тым, як пачаць аналіз асобных сіпакоўскіх элегій, пазначым некаторыя рысы, уласцівыя ім усім у цэлым. У аснове ўсіх элегій паэта, як нам здаецца, ляжыць пэўнае пачуццё ці перажыванне: гэта перш за ўсё даверлівасць, якая дапамагае прайсці лірычнаму герою праз усе выпрабаванні і болі («Здараецца наплыне дабрыня...», «У траве пажухлай і счарнелай...»), але тая ж самая даверлівасць прымушае лірычнага героя шмат пакутаваць і востра адчуваць крыўду («Белыя вароны», «Адзін другога крыўдзім порадзь...», «Ты кінуў слова ў мяне...»), пасля чаго душа ягоная зноў прагне ачышчэння, чарговага катарсісу. Абавязковая рыса элегій Сіпакова – дэкларацыя свабоды асобы як самага галоўнага і асноўнага закону, вызначальнай умовы чалавечага жыцця. «Элегізм» мастака слова пазбягае аднастайнай сумнай танальнасці, псіхалагічнай статычнасці, пачуццёвай расслабленасці, таму ў яго вершах паралельна з самотай вельмі часта існуе ўсмешка. Інакш кажучы, сум выклікае чуццё да радасці, рух да аваладання ёю, нездарма ў паэта ёсць верш «І прыйдзе смутак нечакана...», які можна назваць элегіяй *«суму як прадвесніка радасці»:*

*Таму і смутак нам патрэбен,*
*Каб радасць большаю была.* [5].

І, нарэшце, элегія паэта выразна арыентуецца на дасягненні рамантызму, пры якім гэты жанр дасягнуў найбольшага росквіту.

Уважлівае прачытанне твораў Янкі Сіпакова наводзіць нас на роздум пра «шматступеннасць» выяўлення незадаволенасці лірычнага героя жыццём, ягонай скаргі на абставіны. Не ўсе элегіі паэта маюць аднолькавую канцэнтрацыю пачуцця, непрыняцця і адмаўлення з'яў, і гэта трэба ўлічыць пры іх аналізе, як і пры аналізе лірыкі у цэлым, для якой пафас з'яўляецца найгалоўным зыходным крытэрыем, прадметам сур'ёзнай размовы, ва ўсякім выпадку больш значным, чым пры разглядзе паэтычнага эпасу.

Элегія мае свае жанравыя прыметы, таму не любы верш, прасякнуты сумам, можна назваць ёю, бо ў творчасці паэта-лірыка вельмі часта сум – вынік супярэчнасцей рэчаіснасці: паміж жыццём і смерцю, дабром і злом, застоем і рухам, малым і вялікім і г.д.

У творчасці Янкі Сіпакова даволі пашыраная з'ява – эталагічная элегія, прасякнутая не толькі самотай, але і заклікамі да нечага лепшага, да абнаўлення, дасягнення прыгажосці, радасці, што выклікана, бясспрэчна, адчуваннем лірычнага героя немагчымасці далей пакутаваць і сумаваць і прагай зямной радасці:

*Бяда паглядзела: радасны!*
*Э, гэта ж не той чалавек,*
*Не яе чалавек...* [6].

Працытаваны твор мае выразныя элегічныя прыметы, але сум пад канец яго саступае месца радасці, таму гэтую, несумненна, павучальную элегію можна лічыць элегіяй *«выратавання чалавека ад бяды»* пры дапамозе ачышчальнага ўплыву на яго сіл прыроды. Паэт як бы заклікае чытача і лірычнага героя «паспавядацца» маці-прыродзе, расказаць аб сваіх грахах і няшчасцях, і яна дапаможа ім у такім выпадку. Твор пабудаваны на паступовай градацыі суму, на яго сціханні, таму элегія і завяршаецца клічнай інтанацыяй.

Наступны верш паэта – таксама эталагічная элегія, але ўжо элегія *«абнаўленне духу»*, пабудаваная на пераходнасці і спалучэнні настрою (суму і лёгкай радасці) і танальнасці (мінорнай і мажорнай). Паэт заклікае лірычнага героя скінуць з сябе ўсе путы будзённасці, паглядзець іначай на свет і на сябе і змыць бруд з душы:

*Абнаўленне, хлопцы, абнаўленне*
*Прагнем, нібы ліўня, мы ў цішы.*
*Абнаўленне – гэта ўжо наўленне*
*У дарозе стомленай душы.* [6].

Падобныя нораваапісальныя элегіі ўласцівыя ранейшай творчасці Янкі Сіпакова, можа таму, што маладосць заўсёды імкнецца да новага, нягледзячы ні на цяжкасць, ні на невядомасць, ні на небяспеку, што можа падсцерагаць чалавека на яго шляху.

Эталагічная элегія – гэта *элегія не толькі роздуму, але і дзеяння*, таму часта ствараецца ўражанне, што, калі чытаеш такую, маеш справу не з ёй, а з одай, бо аўтар часта ўжывае клічную інтанацыю, выказваецца не толькі сцішана, але і гучна. І разам з тым, мы адчуваем усю глыбіню аўтарскага балючага перажывання, пакутлівасць яго роздуму над прычынамі духоўнай дэпрэсіі.

Наступная элегія паэта, на якой хочацца спыніцца, драматычная і «рухомая», заснаваная на ўнутраным перажыванні, у ёй горкая радасць і боль замяняюцца ў канцы пранізлівымі радкамі пра складаны і драматычны рух да праўды, да ціхага, але змястоўнага, не ўрачыстага і параднага жыцця («бо нас хвалюе толькі тое, што недасяжнае якраз»):

*А мы ўсё роўна прагнем свята –*
*Аж да апошняе мяжы.*
*І дамагаемся ўпарта,*
*Бо дамагацца – значыць жыць!* [6].

Такім чынам, Янка Сіпакоў у эталагічных элегіях спалучае, здаецца, абсалютна неспалучальныя градацыі чалавечага пачуцця, як сум і радасць, і гэтым набліжае іх да одаў. Падобныя элегіі набываюць адзнакі маштабнасці, рэфлектыўнасці і ператвараюцца ў своеасаблівую споведзь пра сябе і час, пра малое і вялікае, праўду і ману.

Выяўленча-апісальныя элегіі Янкі Сіпакова цалкам пабудаваныя на прыёмах апісання, аповеду, фатаграфавання рэчаіснасці. У іх лірычны герой замілаваны прыродай, лёгка сумуе, або наадварот – рэзка незадаволены станам прыроды і сусвету, востра адчувае сваю адарванасць ад вечных каштоўнасцей, раз'яднанасць з натуральным, а не віртуальным, тэхналагічным наваколлем.

Выяўленчыя элегіі не прэтэндуюць на шырокі ахоп з'яваў рэчаіснасці і цэласнае адлюстраванне падзей. Часцей за ўсё аўтар на прыкладзе адной з'явы раскрывае нескладаную і хутчэй сваю асабістую праблему, не шукаючы спосабаў вырашэння і не паказваючы вытокаў крыўды і незадаволенасці.

Пры чытанні верша «Як хораша ўваліцца...» здаецца, што гэта не элегія, а ўрачысты па змесце твор, дзе перададзена захапленне прыгажосцю прыроды, паяднанасцю з ёй чалавека, але гэта элегія, бо ў ёй прысутнічае не толькі лёгкі сум, але і трывога, падаецца прадчуванне смерці («..што ляжаць, калісьці будзеш між зямлёю і зямлёю»). Аднак зямля не можа поўнасцю вызваліць лірычнага героя ад нейкага цьмянага перажывання, непакою, і таму варушэнне травы здаецца яму такім гучным, як і гук пры падзенні глыбы, бо «спакой – не дужа глыбак»:

*Зварухнулася травіна,*
*А здалося – ўпала глыба!* [6].

Своеасаблівасць выяўленча-апісальнай элегіі заключаецца ў тым, што аўтар як бы міжволі карыстаецца ёй пры апісанні прыроды, зазначаючы сувязь настрою героя са станам прыроды, надвор'я і са станам паэтавай душы, з яго

асабістым настроем. Адпаведны прынцып пакладзены ў аснову элегіі Янкі Сіпакова, якую ўмоўна можна назваць *«злоснай»:*

*Надакучыла навісь слаты,*
*Дзень асенні, як дождж, надакучыў,*
*Адбярыце ў ветра лісты –*
*Ім жа балюча!* [6].

Даўно заўважана, што для стварэння выяўленчай элегіі дастаткова ўзяць які-небудзь факт і адкрыць у ім нейкую новую грань, незвычайнае, раней незаўважанае ці знарок незаўважальнае, павярнуць яго да чытача нейкім невядомым сэнсам. Так, у яшчэ адной элегіі *«трывогі за жывое»* пачуццё аўтара набывае больш высокую эмацыянальную ступень: сум пераўтвараецца ў трывогу, у боль і занепакоенасць, калі лірычны герой у маразы прачынаецца і думае: «Ці не холадна рыбе ў рэчцы, ці не мёрзнуць у руні ногі?» [6].

У адзначаных і да іх падобных элегіях прастора надзвычай звужаная і замкнёная, аўтар не вырашае нейкага складанага пытання, а таму і не лунае думкамі пад неба ці на край света, абмяжоўваецца апісаннем пэўнага сумнага ці канкрэтнага трывожнага пачуцця. Напрыклад, у вершы «Спатыкнешся аб чэрвень, бывае...» паэт крыўдзіцца на лета за яго непрацягласць, і адначасова яго ахоплівае радасць пры ўспамінах аб гэтай пары года:

*Спатыкнешся аб чэрвень, зімою –*
*І забудзеш на ўсе халады...*
*Ты пабудзь, маё лета, са мною...*
*Ну куды ж ты па гурбах, куды.* [6].

Найбольш яркая асаблівасць выяўленча-апісальнай элегіі, магчыма, заключаецца ў тым, што яна грунтуецца на майстэрстве часткі, дэталі, а не цэлага. Так, у яшчэ адной элегіі *«суму, шкадавання жыцця, яго згасання»* аўтар стварае запамінальны вобраз імгненнасці чалавечага жыцця пры дапамозе параўнання яго з летам:

*Не вернуцца гады – мая радня,*
*Жыццё, нібы лета, міне...*
*Нашу настальгію па тых днях,*
*Калі ўжо не будзе мяне.* [6].

Выяўленча-апісальнай элегіі не цесна ў межах традыцыйнай сілаба-тонікі, яна выбірае за асноўны вершаваны памер пераважна анапест, харэй і ямб, але апошнім карыстаецца зрэдку, бо ён перш за ўсё – адзнака філасофскай і медытатыўнай паэзіі. Прыкладам выкарыстання чатырохстопнага ямба з'яўляецца элегія Сіпакова «Калі ад шчасця захмялелы...» – верш з лёгкім і прасветленым сумам і выхадам у канцы на трывогу («...жаўранак з трывожнай песняй у бездань неба патануў...»).

Такім чынам, у сваіх творах Янка Сіпакоў карыстаецца і апісальнай (выяўленчай) элегіяй, хоць яна і не з'яўляецца прыярытэтнай у яго паэзіі, бо больш за ўсё аўтар, як паэт-філосаф, паэт-мысліцель, аддае перавагу медытатыўнаму вершу, дзе не толькі апісана пэўнае пачуццё (сум) і паказана яго градацыя, але і шукаецца выйсце з такога становішча. Разгледжаная разнавіднасць элегіі ў Янкі Сіпакова характарызуецца пошукам новых прыёмаў і сродкаў пісьма, кантактуе з элегіяй эталагічнай і медытатыўнай, аднак, перш за ўсё, арыентуецца на апісанне, паказ, а не пераасэнсаванне, ацэнку, на пачуццё, а не на думку, на эмацыянальны выгук, а не на асэнсаваную інтэрпрэтацыю рэчаіснасці.

Янка Сіпакоў – мастак, які пастаянна ўдасканальвае свой стыль, сваю паэтыку, таму ў яго творчасці заўсёды адбываюцца змены – рух ад простага да складанага. Так, у межах аднаго жанру – элегіі – відавочна паступовая стылёвая эвалюцыя аўтара – ад апісальнасці, выяўленчасці да заглыблення ў сфе-

ру свядомага, напружанага асэнсавання рэчаіснасці з мэтай выяўлення яе істотных заканамернасцей, да самапаглыблення, медытатыўнасці.

Медытатыўная элегія – гэта элегія актыўнай думкі, высокага аналітызму, напружанага, але разумна арганізаванага, гарманічнага перажывання. Янка Сіпакоў паўстае ў такога роду творах філосафам, які ўдумліва пазнае сябе і свет, спасцігае складаныя праблемы чалавечага існавання, гісторыі, жыцця чалавека і сусвету. Паэт у такіх вершах як бы працягвае традыцыі медытатыўнай элегіі, цэнтральны нерв якой складаюць пакуты і перажыванні сумленнага чалавека, які бачыць як драбнеюць людзі, іх пачуцці, як паддаюцца яны спакусе лёгкага і бязбеднага жыцця, апранаюць маскі задаволенасці ўсім, сытасці і спакою:

*Сядзім. Спяваем. Спеў – пад столь.*
*Мы весялімся, нібы дзеці...*
*А болю – цесна болю: у свеце*
*Перанаселенасць на боль.* [6].

Гэта медытатыўная элегія *«болю»*, у якой паэт разважае пра сучасны стан чалавецтва, пра яго здрабненне і жорсткасць, адсутнасць міласэрднасці. І толькі паэту не ўсё роўна, а таму ён перажывае, спачувае нават гэтай здрабнелай частцы чалавецтва:

*Дзе нам баліць, там і душа:*
*З душы ўвесь чалавек сабраны.*
*Мы адкрываем нечакана –*
*Дзе нам баліць, там і душа.*
*Таму чым большая душа, -*
*Даўжэй шчымяць і ноюць раны...*
*Дзе нам баліць, там і душа:*
*З душы ўвесь чалавек сабраны.* [6].

Вось такое адчуванне дысгармоніі свету і чалавечай душы нараджае адпаведную жанравую элегію Янкі Сіпакова – *медытатыўную элегію з адзнакамі трагедыйнасці, з арыентацыяй на перадачу пульсацыі думкі, на аналітычны, а не апісальны падыход да рэчаіснасці.*

Не менш яркім узорам медытатыўнай элегіі з'яўляецца твор «Мой агонь пастарэў на год...» – верш-разважанне, медытацыя, унутраны маналог, які выносіцца на суд чытача. На першым плане тут – псіхалагічны свет паэта, яго эмацыянальны свет і імкненні, накіраванасць думкі і пачуцця у глыб самога сябе, на самыя шчырыя перажыванні і імкненні. Гэтая элегія – разгорнуты філасофскі тэзіс пра тое, што так не хочацца страціць, элегія *«ачышчэння агнём»*, і вытокі яе асноўных вобразаў – у паганстве. Дарэчы, нешта падобнае назіраем і ў творах Майсея Сяднёва, паэта-эмігранта, які назваў сваю асноўную кнігу вельмі характэрна – «Ачышчэнне агнём».

*Мой агонь пастарэў на год,*
*Маё вогнішча вечарэе.*
*Ачышчае мяне ад нягод*
*І звядае само, як лілея.* [6].

Душа лірычнага героя, як і душа паэта з яго даверлівасцю, асабліва востра рэагуе на несправядлівасць і здрадніцтва, што адбываецца ў свеце, і асабліва на здраду сябра. Таму ў Янкі Сіпакова нарадзілася элегія «Пасівела душа, пасівела...», напісаная нібы з пазіцый агульначалавечнасці, калі адкідваецца зло і ўсхваляецца дабро, шануецца святое і выкрываецца фальшывае, антыгуманнае, калі нават у здрадзе паэт спрабуе ўбачыць нешта апраўдальнае:

*Пасівела душа, пасівела,*
*Але ёсць і ў сівой свая радасць:*
*Гэта чысты спакой заінелы,*
*Гэта ціша зімовага саду...* [6].

Даволі часта Янка Сіпакоў даследуе пераходны стан чалавечай душы, пагранічча, памежжа, як сказалі б А. Бельскі, І. Чарота, калі ёй блізкі смутак і трывога. Ён выразна бачыць адрозненне паміж гэтымі двумя пачуццямі. У вершы «Сумую я па лыжным следзе» паэт ставіць іх побач, каб адцяніць складанасць перажыванняў чалавека, калі «ўспамінаюцца самотна зіма і снег...». Гэтая медытатыўная элегія напісана традыцыйным памерам – чатырохстопным ямбам, які як бы «спрыяе» працэсу перадачы роздумнасці. Адзначым, што і ў многіх іншых творах Сіпакова вершаваны памер павязаны з жанравым настроем і пафасам. Тут жа па кантрасце са светлымі ўспамінамі падаецца самотны і трывожны сум («А што будзе далей?», – нібы пытаецца ў сябе паэт).

Як ужо адзначалася, часцей за ўсё ў паэта ямбічны памер працуе на выяўленне значнага філасофскага зместу, гэта адбываецца, як і ў рускага паэта Яўгена Баратынскага, які пісаў вершы, дзе пераважае думка, такім самым памерам. І наступны верш-элегія *«трывогі, тугі і суму»* (гэтыя словы паўтараюцца аж 12 разоў) адпавядае сказанаму:

*Адкуль, адкуль ён, гэты лёгкі сум?*
*Яны ж кахаюць, бачыце, – кахаюць.*
*Кахання свайго чыстую красу,*
*Як немаўля, абачліва люляюць.*
*Адкуль, адкуль ён, гэты лёгкі сум?* [6].

Медытатыўная элегія – гэта жанр, якім найчасцей карыстаецца паэт у зборніку «У поўдзень, да вады». Пасля гэты жанр быў заменены ў «Вечы славянскіх балад» баладай, але і ў гэтай кнізе элегія пакінула свой след: у многіх баладах застаўся настрой суму (асабліва ў пранізліва-балючай – «Вяселле»).

У Янкі Сіпакова можна назіраць таксама спалучэнне адзнак медытатыўнай элегіі з адзнакамі оды. Так, верш «Чыстае слова» – элегія *«роздуму»* з яскрава выражанымі адзнакамі адычнага настрою. Такім чынам, у паэзіі Янкі Сіпакова назіраецца яшчэ і збліжэнне гэтых двух жанраў на глебе зліцця разнавіднасцей пафасу – гераічнага і трагедыйнага, а таксама павучальнага і роздумнага пачаткаў. Відавочна, што элегія Янкі Сіпакова – самы актыўны жанр у яго творчасці, у якім сыходзяцца рысы апісальнай і медытатыўнай паэзіі з адзнакамі маштабнасці, рэфлектыўнасці. У творчасці паэта яна ператварылася ў размову мастака з чытачом пра час і пра сябе, набыла адзнакі трагедыйнасці, удала сканцэнтравала ў сябе некаторыя рысы балады і оды.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Рагойша В.П.*** Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. Мн., 2001. С. 356-357.
2. ***Анталогія беларускай эпітафіі.*** Мн., 2000. С. 38-39.
3. ***Рагойша В.П.*** Паэтычны слоўнік. 2-е выд., дапрац. і дапоўн. Мн., 1987. С. 382.
4. ***Мішчанчук М.І.*** Ёсць у паэта свой аблог цалінны... Мн., 1992. С.115, 129.
5. ***Сіпакоў Янка.*** У поўдзень, да вады. Мн., 1976. С.36.
6. ***Сіпакоў Янка.*** Выбраныя творы ў 2 т. Т. 1. Паэзія. Мн., 1995. С.105, 137, 127, 25, 134, 133, 133, 142, 131, 134, 128, 136, 159.



## *SUMMARY*

*The article depicts the pecularity of Yanka Sipakov's lyric poetry, who is a representative of philological generation. It uncorers the specificity of its genre and style.*

*His observations are based on the conception of the variability of lyricpoetry as a tipe of literature acordong to which it may be depicting, descriptive and meditative.*

*The poet's creative work is given in the context of literary process in 50-s–60-s of the XX$^{th}$ century.*


*Поступила в редакцию 24.05.2002*